использует тесты и наглядные занимательные видеосюжеты. Учитель при этом превращается из наставника-преподавателя в обычного лаборанта, который максимально старается облегчить путь студента к усвоению материала, практичнески полностью устраняется как личность из учебного процесса и сводит свою роль к рекомендациям методических материалов и демонстрации графиков и таблиц. Тем не менее, главным навыком образованного человека всегда была и будет способность ответа на непредвиденную ситуацию, навык творчества, следствием которого является полезный опыт. В современной образовательной системе наметилась опасная инновационная тенденция, когда критический поиск ума заменяется пассивным восприятием развлекательной информации. В наибольшей степени развитию критического мышления способствует изучение гуманитарные дисциплин. Углубленное знания в этой сфере нужны именно для студентов, получающих высшее университетское образование. Ведь именно данные учебные заведения являются основным поставщиком научных кадров для нашего государства. Дело в том, что человек принципиально не в состоянии познавать мир в качестве стороннего наблюдателя, так как он с неизбежностью является активным элементом изучаемой им реальности. Целостное видение действительности может дать лишь мировоззрение, а оно в качестве своего центрального системообразующего элемента предполагает не естественно-научные, а именно гуманитарные знания.

В заключение отметим, что мало пользы приносят нашей образовательной системе также идеи о соединении национальной традиции с так называемыми «лучшими достижениями всех народов», с общечеловеческими ценностями. Их дефинировать достаточно сложно, и каждый исследователь начинает трактовать общечеловеческие ценности по-своему. Существует реальная опасность сохранения материальной формы традиции при полном исчезновении ее внутреннего, духовного содержания.

Список использованных источников

1. Гадамер, Х.-Г. Истина и метод: Основы философской герменевтики / Х.-Г. Гадамер. – Москва: Прогресс, 1988. – 704 с.

УДК 94(476)

# САЦЫЯЛЬНАЯ МАБІЛЬНАСЦЬ ЖАНЧЫН-СТАХАНАВАК БССР (1935 – 1941 ГГ.)

***Субоцін А.А., ст. выкл.***

*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*

*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Рэферат. *У артыкуле былі прааналізаваны пытанні, звязаныя са зменамі ў сацыяльным статусе жанчын, што ўдзельнічалі ў стаханаўскім руху. Было выяўлена, што жанчыны, стаўшы стаханаўкамі, атрымалі новыя сацыяльныя ролі вытворчых гераінь і ўвайшлі ў працоўную эліту, апошняе дазволіла актывізаваць дзяржаўную палітыку па прасоўванні работніц і калгасніц на адказныя і кіруючыя пасады.*

Ключавыя словы: стаханаўскі рух, стаханаўкі, сацыяльны статус, сацыяльная мабільнась.

У гуманітарных навуках на сучасным этапе ўзрасла цікавасць да вывучэння праблем сацыяльнага, эканамічнага і палітычнага становішча жанчын. Такая тэндэнцыя звязана сёння з павышэннем іх ролі ў розных сферах жыцця грамадства, а таксама з актывізацыяй жаночых і феміністскіх рухаў. Для ўсебаковага даследавання гендэрных праблем важным з'яўляецца аналіз асаблівасцяў становішча жанчын у савецкі перыяд, калі адбылося шырокае ўключэнне прадстаўніц жаночага полу ў грамадскую вытворчасць і назіраліся некаторыя змены ў іх сацыяльным статусе. Асаблівы ўплыў на дадзеныя працэсы аказаў стаханаўскі рух, які разгарнуўся ў рамках палітыкі фарсіраванай індустрыялізацыі і суправаджаўся значнай актывізацыяй працоўнай дзейнасці жанчын.

У рамках развіцця стаханаўскага руху жанчыны БССР нараўне з мужчынамі сталі яго актыўнымі ўдзельніцамі, асабліва гэта датычылася галін лёгкай прамысловасці і сельскай гаспадаркі, дзе пераважалі вытворчыя аперацыі, арыентаваныя на прымяненне жаночай



Витебский государственный технологический университет

працоўнай сілы. Праз удзел у стаханаўскім руху работніцы і калгасніцы мелі магчымасць не толькі праявіць свае працоўныя здольнасці, але і змяніць сваё становічша ў грамадстве. Жанчыны, стаўшы стаханаўкамі, уваходзілі ў элітную катэгорыю працоўных, а іх гендэрны статус быў адзначаны новымі сацыяльнымі ралямі герояў вытворчай сферы, якія былі замацаваны да гэтага пераважна за мужчынамі. Менавіта ў ходзе стаханаўскай кампаніі многія жанчыны і атрымалі магчымасць стаць па выніках сваёй выдатнай працы знакамітымі гераінямі. Так, дзякуючы прапагандзе сацыялістычнага спаборніцтва праз публікацыі ў газетах, выданне папулярных брашур, арганізацыю злётаў перадавікоў, у БССР у другой палове 1930-х гг. сталі вядомымі імёны такіх лепшых стаханавак, як Д. Папкова, С. Быкоўская, А. Семянідава, М. Дзяжурная, П. Пярцова, С. Башкірава, М. Цыгельніцкая, Т. Лычкоўская і іншыя, пры гэтым некаторыя з іх атрымалі вядомасць і на ўвесь СССР [1, с. 3; 2; 3; 4, с. 107 – 110; 5, с. 4].

Працэс «гераізацыі» стаханавак быў адзначаны высокай сацыяльнай мабільнасцю, калі за кароткі прамежак часу жанчыны хутка праходзілі некалькі сацыяльных ступеняў і станавіліся прадстаўніцамі працоўнай эліты. Напрыклад, за некалькі месяцаў шлях ад звычайнай хатняй работніцы да знакамітай стаханаўкі рэспублікі прайшлі С. Ждановіч і Э. Гомельская [2, с. 20; 6, с. 5]. Уваходжанне жанчын, што ўдзельнічалі ў стаханаўскім руху, у склад працоўнай эліты і атрыманне імі статусу гераінь паспрыяла ў далейшым і іх кар'ернаму росту: сацыяльная мабільнасць пачынае адзначацца прасоўваннем стаханавак уверх па службовай лесвіцы, у тым ліку і прызначэннем на кіруючыя пасады. Напрыклад, у склад кіруючага персаналу ніжэйшага і сярэдняга звяна было пераведзена 13 стаханавак Віцебскай ільнопрадзільнай фабрыкі «Дзвіна» да свята 8 Сакавіка ў 1936 г. [7, с. 6]. У тым жа годзе на Мінскай швейнай фабрыцы імя 8 Сакавіка стаханаўкі Малентовіч і Гертэнзон былі вылучаны памочніцамі начальнікаў цэхаў, выдатніцы працы Руткевіч, Міхайлава і Зайдман – інструктарамі брыгад [8, с. 4]. У 1937 г. у Гомелі стаханаўка А. Сенчыла (камбінат «Спартак») стала зменным майстрам, ткачыха-перадавік М. Анісавец з арцелі «Гомельскі тэкстыль» была пераведзена на пасаду памочніка майстра [9, арк. 21, 22]. Яскравым прыкладам таго, наколькі перспектыўным было становішча ўдзельніц стаханаўскага руху ў прасоўванні іх на адказныя адміністрацыйна-гаспадарчыя пасады, можна лічыць прызначэнне ў 1938 г. стаханаўкі Мінскай швейнай фабрыкі «Кастрычнік» А. Зелянко на пост дырэктара швейнай фабрыкі імя 8 Сакавіка [10]. Так, з сярэдзіны 1930-х гг. стаханаўскі рух становіцца асноўнай крыніцай для ажыццяўлення дзяржаўнай палітыкі па вылучэнні жанчын на адказныя пасады, пры гэтым перспектывы стаць ІТР і гаспадарнікамі стаханаўкі атрымлівалі зноў такі ў галінах з пераважна жаночай занятасцю ці на вытворчых працэсах, арыентаваных на жаночую працоўную сілу.

Асаблівую ўвагу ў працэсе вылучэння жанчын на адказныя пасады ўладныя структуры надавалі сельскагаспадарчай вытворчасці, дзе прадстаўніцы жаночага полу складалі абсалютную большасць сярод стаханаўцаў і станавіліся такім чынам галоўным рэзервам папаўнення кіруючых кадраў аграрнага сектару. Неабходнасць актыўнага вылучэння стаханавак сельскай гаспадаркі рэспублікі была вызначана старшынёй СНК БССР М. Галадзедам у снежні 1935 г. на сесіі ЦВК [11, с. 48], а 31 кастрычніка 1936 г. ЦК КП(б)Б выдаў Пастанову аб вылучэнні жанчын-калгасніц на кіруючую працу, у якой была пастаўлена задача на працягу 1 – 2 гадоў дабіцца таго, каб значную частку старшынь калгасаў, калгасных брыгадзіраў, загадчыкаў калгасна-таварных ферм складалі жанчыны. Асноўнымі прэтэндэнтамі на заняцце пералічаных пасад партыйным кіраўніцтвам рэспублікі былі вызначаны, для прыкладу, трактарысткі, якія давалі выпрацоўку на трактарах да 1 тысячы га, а таксама льнаводкі і льнотрапальшчыцы, што дабіваліся ўраджаю льну каля 10 ц з гектара [12, с. 221].

У адпаведнасці з вызначанай палітыкай у 1936 г. на сходах і пленумах сельскіх Саветаў Полацкага раёна на адказную калгасную работу (загадчыцамі ферм, брыгадзірамі і на іншыя пасады кіруючага звяна) было вылучана 27 жанчын з ліку лепшых стаханавак, па мясамалочных саўгасах БССР у тым жа годзе на кіруючую гаспадарчую, прафсаюзную і грамадскую працу было вылучана каля 100 лепшых стаханавак [13, арк. 87; 14, арк. 19]. Некаторыя ўдзельніцы стаханаўскага руху з цягам часу ўзначалілі асобныя гаспадаркі. Так, напрыклад, лепшая стаханаўка Кіраўскага раёна А. Вінаградава ў 1939 г. была вылучана на пост старшыні калгаса імя Кірава [15, арк. 181].

Стаханаўскі рух хаця і паспрыяў новым зменам сацыяльнага становішча жанчын, адкрыўшы ім перспектывы кар'ернага росту і прасоўвання ўверх па службовай лесвіцы, вылучэнне стаханавак на адказныя пасады выклікала ў некаторых выпадках рэакцыі

Витебский государственный технологический университет

непрызнання за імі гэтых новых роляў. Стаханаўка М. Мацулевіч (г. Віцебск), напрыклад, так успамінала сваё прызначэнне на пасаду майстра: «В 1935 г. в декабре меня назначили как лучшую на должность сменным мастером. Это была первая женщина-мастер в то время, не смотря на то, что моя смена работала хорошо, план перевыполняла, и не было разницы среди женщин и мужчин, работать в то время мастером женщине было очень трудно, не хотели признавать женщину как мастера и называли баба-мастер» [16, арк. 5 адв.].

Засванне новых роляў гераінь і мадэляў сацыяльных паводзін, што адзначаліся актыўнай працоўнай дзейнасцю ў грамадскай вытворчасці, выклікала, аднак, праблему так званай “падвойнай занятасці” жанчын, калі акрамя сваёй працы на прадпрыемствах на іх па-ранейшаму ўскладваўся клопат пра сям’ю і вядзенне хатняй гаспадаркі. Больш таго, знатны статус жанчын-стаханавак патрабаваў выконваць свае хатнія абавязкі на такім жа высокім узроўні, як і працу на прадпрыемствах. Удзельніцы стаханаўскага руху павінны былі стаць прыкладам для астатніх жанчын і як перадавікі вытворчасці, і як выдатныя хатнія гаспадыні. Нездарма ў сваім інтэрв’ю ў газету «Звязда» стаханаўка Д. Папкова акрамя таго, што распавядала пра свае вытворчыя дасягненні і паляпшэнне матэрыяльнага становішча, яшчэ адзначыла і змены сваіх адносін да хатніх абавязкаў: «Я хоць і раней сур’ёзна займалася выхаваннем сваіх дзяцей, але цяпер яшчэ больш гэтаму аддаю ўвагі» [17, с. 3].

Такім чынам, стаханаўскі рух меў важныя сацыяльныя наступствы для жанчын, што прынялі ў ім удзел: яны сталі прадстаўнікамі працоўнай эліты рэспублікі і атрымалі шырокія магчымасці набываць сацыяльныя ролі герояў вытворчасці, што раней у большасці сваёй звязваліся з гендэрным статусам мужчын. Сацыяльная мабільнасць стаханавак праяўлялася ў іх прасоўванні ўверх па службовай лесвіцы і атрыманні гаспадарча-адміністрацыйных пасад. Нягледзечы на тое, што жанчыны засвойвалі новыя сацыяльныя ролі гераінь, перадавікоў вытворчасці, за імі па-ранейшаму заставаліся традыцыйныя функцыі па вядзенні хатняй гаспадаркі, якія для стаханавак набывалі формы ідэальнага выканання. Гэта значна ўскладняла праблему «падвойнай занятасці», калі трэба было і выдатна працаваць, і быць выдатнай маці і гаспадыняй. Акрамя таго, высокі статус стаханавак у некаторых выпадках скептычна ўспрымаўся ў працоўных калектывах, што было звязана з ранейшымі гендэрнымі стэрэатыпамі пра немагчымасць жанчын быць лепшымі працоўнымі і займаць адказныя пасады.

Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Зарубежны, А. Стаханаўкі швейнага гіганта / А. Зарубежны // Звязда. – 1936. – 8 сакавіка. – С. 3.
2. Стахановцы спиртовой промышленности БССР / сост. И.М. Ярмошевич. – Мн.: Гос. изд-во Белоруссии, 1936. – 78 с.
3. Стаханаўцы «Камунаркі». – Мн.: Дзярж. выд-ва Беларусі, 1936. – 64 с.
4. Кудзінаў, С. Стаханаўскі рух у мясамалочных саўгасах БССР / С. Кудзінаў // Соцыялістычнае будаўніцтва. – 1936 – № 1-2 – С. 107 – 110.
5. Чэтверыкоў, В.Н. Як стаханаўцы-калгаснікі Чавускага раёна атрымалі тону льновалакна з гектара / В.Н. Чэтверыкоў. – Мн.: Выд-ва АН БССР, 1937. – 88 с.
6. Стаханаўскім шляхам. – Мн.: Дзярж. выд-ва Беларусі, 1936. – 64 с.
7. Міжнародны камуністычны жаночы дзень // Звязда. – 1936. – 9 сакавіка. – С. 6.
8. Лепшыя стаханаўкі вылучаюцца на кіруючыя пасады // Звязда. – 1936. – 3 красавіка. – С. 4.
9. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13024. Докладная секретаря Гомельского обкома КП(б)Б о работе промышленности Гомельской области за первое полугодие 1938 г.
10. Стахановка Минской швейной фабрики «Октябрь» Зеленко А.В., выдвинутая на пост директора Минской швейной фабрики «8 Марта» (фото 1938 г.) // Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў. – Арх. № 1-646.
11. Народна-гаспадарчы план 1936 стаханаўскага года // Соцыялістычнае будаўніцтва. – 1936. − № 1-2. – С. 15 – 85.
12. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК: в 6 т. / Ин-т истории при ЦК КПБ. – Мн.: Беларусь, 1983 – 1987. – Т. 3: 1933 – 1945 / под ред. Г. Г. Барташевича и др. – 1985. – 551 с.
13. Дзяржаўны занальны архіў у г. Полацку. – Фонд 104. – Воп.1. – Спр. 93. Постановления, циркуляры Президиума ЦИК БССР, постановления Дриссенского и Освейского РК КП(б)Б, доклады оргмассовой работы Сельских Советов, о результатах


Витебский государственный технологический университет

обсуждения Конституции (7 декабря 1935 г. – 10 декабря 1936 г.).
14. НАРБ. – Фонд 297. – Воп. 1 – Спр. 58. Переписка ЦП Союза мясомолочных совхозов БССР о ходе социалистического соревнования и копии договоров о социалистическом соревновании коллективов рабочих совхозов (17 февраля 1936 г. – 20 августа 1936 г.).
15. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 14253. Справки заведующего сельскохозяйственным отделом, инструктора ЦК КП(б)Б о состоянии пограничных колхозов и о состоянии партийно-массовой работы в колхозах отдельных районов БССР.
16. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Фонд 9742. – Воп. 3. – Спр. 33. Мацулевич М.С., воспоминания бывшей работницы завода «Красный Октябрь» о начале трудовой деятельности и участии в соревновании, получении значка отличника производства.
17. Зарубежны, А. У гасцях у знатнай стаханаўкі / А. Зарубежны // Звязда. – 1935. – 14 лістапада. – С. 3.

УДК 316.7

# САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ КАМУНІКАЦЫІ ЖЫХАРОЎ БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКАГА ПАМЕЖЖА Ў ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

***Хаданёнак В.М., канд. гіст. навук, дац.***

*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*

*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Рэферат. *У артыкуле разгледжаны асаблівасці сацыякультурных камунікацый жыхароў беларуска-расійскага памежжа ў наш час. Асаблівая ўвага звернута на захаванне культурна-гістарычнай самабытнасці грамадства ў памежных рэгіёнах.*

Ключавыя словы: памежжа, геапалітыка, культурная самабытнасць, міжэтнічныя кантакты, сацыякультурныя камунікацыі, ідэнтычнасць.

Беларуска-расійскае памежжа даволі ўнікальны і спецыфічны рэгіён на геапалітычнай карце Ўсходняй Еўропы. Яго геаграфічныя абрысы акрэсліць дастаткова складана, бо разглядаемыя землі адносіліся да розных дзяржаўных утварэнняў і не былі статычнымі ў прасторава-часавым кантынууме. Сёння пад беларуска-расійскім памежжам прынята разумець тэрыторыю асобных раёнаў 6 абласцей: Віцебская, Магілёўская, Гомельская (Рэспубліка Беларусь), Пскоўская, Смаленская, Бранская (Расійская Федэрацыя). Лёс гэтых земляў на працягу стагоддзяў быў даволі незайздросны. Яны з'яўляліся своеасаблівым яблыкам раздору і неаднаразова пераходзілі з рук у рукі кіраўнікоў розных дзяржаўных утварэнняў. Тут варта ўзгадаць памежныя войны Вялікага княства Літоўскага і Маскоўскага княства 1492 – 1494 гг., 1500 – 1503 гг., войны за Смаленск, узброеныя канфлікты пачатку і сярэдзіны XVII ст. і інш. У першай чвэрці XX ст. лёс гэтых тэрыторый вызначаўся пераважна мірным шляхам, шляхам дыпламатычных перамоў, але пры гэтым даволі часта не ўлічваліся меркаванні і жаданні насельніцтва гэтых рэгіёнаў.

Сёння мы маем даволі няпростую геапалітычную сітуацыю ў свеце. Зноў разгарэліся адкрытыя ваенныя канфлікты, цэлы шэраг вострых супярэчнасцяў носяць латэнтны характар. Нягледзячы на гэта, сацыякультурная сітуацыя на беларуска-расійскім памежжы вызначаецца міралюбівай і прыязнай атмасферай з абодвух бакоў. Не можа не радаваць наяўнасць актыўных кантактаў паміж суб'ектамі беларуска-расійскага памежжа ў эканамічнай і палітычнай сферах. Асабліва шчыльнае супрацоўніцтва адбываецца ў галіне культуры. Прычым формы гэтых сацыякультурных зносін розныя: абмен творчымі візітамі, літаратурныя вечарыны, сацыякультурныя камунікацыі пры дапамозе новых інфармацыйных тэхналогій і інш. Разам з культурнымі стасункамі суб'ектаў беларуска-расійскага памежжа назіраецца і разуменне важнасці захавання сваёй культурнай самабытнасці беларускім і рускім народам.

Безумоўна, сяброўскія адносіны Беларусі і Расіі мусяць грунтавацца на рэгулярных і чаканых, а не на выпадковых культурных сувязях. Пры гэтым важна, каб культурныя амбіцыі і завостранае самалюбства не перараслі з цягам часу ў нецярпімасць і непрыязнасць да

Витебский государственный технологический университет